# АКАДЭМІК У. І. ПІЧЭТА

Выдатны савецкі вучоны Уладзімір Іванавіч Пічэта нарадзіўся ў Палтаве 9 (22) кастрычніка 1878 г. Яго бацька паходзіў з Герцагавіны, быў выкладчыкам гісторыі, а некаторы час рэктарам семінарый у Палтаве і Віцебску. У 1898 г. У. І. Пічэта паступіў на гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага універсітэта, які скончыў у 1901 г. Яго дыпломную працу «Юрый Крыжаніч аб Маскоўскай дзяржаве» высока ацаніў В. В. Ключэўскі.

Пачаўшы друкавацца ў 1904 г., Пічэта апублікаваў шмат навуковых прац па многіх праблемах гісторыі Расіі, Украіны, Літвы, Польшчы, Чэхіі і паўднёвых славян. Аднак цэнтральнае месца ў творчай спадчыне Пічэты займала гісторыя Беларусі: з 500 ягоных прац каля 140 прысвечаны гісторыі Беларусі. Праблема этнагенезу беларускага народу, сацыяльна-эканамічнае развіццё і гісторыя права Беларусі, гістарыяграфія і гісторыя беларускай культуры, археалогія і краязнаўства, педагогіка і беларуская літаратура — усё гэта было прадметам даследавання ў працах Пічэты.

Гісторыю Беларусі Пічэта пачаў вывучаць яшчэ да Кастрычніцкай рэвалюцыі. Так, у 1909—1910 гг. паявіліся яго артыкулы «Літоўска-польскія уніі і адносіны да іх літоўска-рускай шляхты» і «Літоўска-руская дзяржава» — першыя «подступы» вучонага да беларускай тэмы.

Вельмі плённы для У. І. Пічэты быў 1918 г. 18 лютага ён стаў магістрам рускай гісторыі (тэма дысертацыі «Аграрная рэформа Сігізмунда-Аўгуста ў Літоўска-Рускай дзяржаве», ч. I—II), а праз месяц — доктарам гісторыі (па той жа тэме, ч. III—IV).

Двухтомная манаграфія Пічэты —



першая вялікая праца па гісторыі феадальных адносін у Беларусі ў XVI ст. У ёй вучоны найбольш поўна даследаваў аграрную рэформу 1557 г., вядомую ў гістарычнай літаратуры пад назвай валочнай памеры. М. Ф. Уладзімірскі-Буданаў, М. В. Доўнар-Запольскі, М. К. Любаўскі і іншыя гісторыкі бачылі ў рэформе толькі заканадаўчы акт, прадыктаваны чыста фінансавымі меркаваннямі,— У. І. Пічэта ўгледзеў у ёй

імкненне пануючага класа ўзмацніць феадальна-прыгонніцкую эксплуатацыю сялянскіх мас.

Улетку 1918 г. Пічэта прачытаў курс лекцый «Гісторыя беларускага народу» ў Беларускім народным універсітэце ў Маскве. Тады ж у Маскве ўтварылася Беларускае навукова-культурнае таварыства, і адным з яго заснавальнікаў, разам з М. А. Янчуком, В. І. Качалавым (Шверубовічам) і інш., быў У. І. Пічэта, які неўзабаве стаў старшынёй Таварыства.

Жыццё і навуковая дзейнасць У. І. Пічэты непарыўна звязаны з гісторыяй Беларускага дзяржаўнага універсітэта, рэктарам якога ён быў з 1921 па 1929 г. З 1921 па 1930 г. Пічэта — прафесар БДУ, дзе чытае курсы гісторыі БССР, гісторыі народнай гаспадаркі Расіі і Беларусі, гісторыі рускага і беларускага права, а таксама вядзе семінарскія заняткі па гэтых дысцыплінах.

Адна за адной друкуюцца працы Пічэты: «Гісторыя Беларусі» (1924), «Эпоха гарадское гаспадаркі на Беларусі» (1925), «Полацкая зямля ў пачатку XVI ст.» (1926), «Гістарычны лёс Заходняй Беларусі» (1927), «Гаспадарскія (велікакняскія) двары ў заходніх валасцях Беларусі пасля рэформы Жыгімонта-Аўгуста» (1927), «Гісторыя сельскай гаспадаркі і землеўладання ў Беларусі, ч. I (да канца XVI ст.)» (1927). У гэтых і многіх іншых даследаваннях Пічэта раскрыў эканамічныя і палітычныя ўмовы, у якіх усталёўвалася фальваркова-паншчынная сістэма на землях Вялікага княства Літоўскага, прааналізаваў прадукцыйныя сілы сельскай гаспадаркі Беларусі (да канца XVI ст.), выказаў і абгрунтаваў важную думку пра тое, што ў працэсе ўзнікнення і развіцця феадальнага маёнтка на тэрыторыі Беларусі і Літвы вялікую ролю адыграў унутраны рынак. Асаблівую ўвагу аддаваў Пічэта эвалюцыі сацыяльна-эканамічнага становішча сялянскіх мас Беларусі.

Зыходзячы з марксісцка-ленінскага разумення працэсу фармавання нацыі, У. І. Пічэта ў артыкуле «Распрацоўка гісторыі літоўска-беларускага права XV—XVI ст.ст. у гістарыяграфіі»[1] тэарэтычна абгрунтаваў неабходнасць самастойнага вывучэння гісторыі беларускага права.

Цяжка пераацаніць заслугі У. І. Пічэты як гісторыка беларускай культуры. Вядомы савецкі гісторык С. У. Бахрушын пісаў: «У. І. Пічэта любіў Беларусь, любіў беларускі народ, востра адчуваў нягоды, якія гэты народ перацярпеў у мінулым, і радаваўся шчасцю, якое наступіла для яго ў нашы дні. Любоў да беларускага народу знайшла сваё выяўленне ў той выключнай цікавасці, якую Уладзімір Іванавіч праяўляў да яго культуры, да яго пісьменства, да яго мовы...»[1]

І па сёння не страцілі свеёй навуковай каштоўнасці працы У. І. Пічэты «Беларуская мова як фактар нацыянальнай культуры» (1924), «Беларускае адраджэнне ў XVI стагоддзі» (1926), яго артыкулы пра вялікага беларускага гуманіста Скарыну («Францішак Скарына і яго працы»[2], «Друк на Беларусі ў XV і XVI стагоддзях»[3], «Скарыніяна»[4]).

Як успамінае ў лісце да аўтара гэтых радкоў студэнт БДУ 20-х гадоў М. М. Улашчык (цяпер доктар гістарычных навук, старэйшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі СССР АН СССР), калі ў 1924 г. у БДУ арганізаваўся краязнаўчы гурток, У. І. Пічэта выказаў пажаданне стаць яго старшынёй. Увосень 1926 г. гурток быў пераўтвораны ў Краязнаўчае таварыства. У 1927 г. яно арганізавала археалагічную экспедыцыю на Палессе.

Вялікае палітычнае і культурнае значэнне мелі навуковыя камандзіроўкі Пічэты ў Польшчу, Чэхаславакію, Германію, Нарвегію, дзе ён выступаў з лекцыямі па гісторыі беларускага народу, з дакладамі аб дасягненнях Савецкай Беларусі. У справаздачы народнаму камісару замежных спраў аб адной са сваіх камандзіровак (восень 1927 г.) У. І. Пічэта пісаў: «...Па прапанове і просьбе савецкага пасольства ў Празе я выступіў з дакладамі ў двух таварыствах, у якіх я чытаў даклады аб культурных дасягненнях сучаснай Беларусі. Адзін даклад быў прачытаны ў студэнцкім беларускім таварыстве, а другі даклад быў мною прачытаны 6 ліпеня ў Таварыстве зближэння Чэхіі з Новай Расіяй... Аб Беларусі ў Чэхіі і ў Заходняй Еўропе фактычна ніхто нічога не ведае... Прафесар Францаў, які займае кафедру рускай мовы, па словах студэнтаў-беларусаў, пачынае страшэнна злавацца, калі студэнт упамінае слова «Беларусь». Лічачы такое становішча ненармальным... я дамовіўся... што напішу два артыкулы: адзін пра Францыска Скарыну, а другі — пра беларускае нацыянальна-культурнае адраджэнне»[5].

У. І. Пічэта — адзін з арганізатараў Інстытута беларускай культуры ў 1922 г., дзе доўгі час быў старшынёй гісторыка-

[1] «Полымя», 1926, № 8.

[1] «Ученые записки Института славяноведения АН СССР», т. I, 1949, стар. 9—10.

[2] «Савецкая Беларусь», 24 і 25 снежня 1925 г.

[3] «Чатырохсотлецце беларускага друку». Мінск, 1926, стар. 228—261.

[4] Там жа, стар. 284—327.

[5] Цэнтральны дзяржаўны архіў Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва БССР, ф. 205, воп. 3, адз. зах. 6335, арк. 33—34.

археалагічнай секцыі. Разам з Пічэтам актыўны ўдзел у арганізацыі Інбелкультa прымаў Якуб Колас. Хутка Пічэта запрашае Якуба Коласа на пасаду выкладчыка беларускай мовы і літаратуры ў БДУ.

Выступаючы на VIII Усебеларускім з'ездзе Саветаў (11 красавіка 1927 г.), У. І. Пічэта прапанаваў арганізаваць у Беларусі Акадэмію навук. «У сучасны момант у г. Мінску і на ўсёй тэрыторыі Беларусі маецца шмат усякіх навуковых устаноў, у якіх вядзецца вялікая навуковая праца,— сказаў Уладзімір Іванавіч.— Кнігі нашых вучоных друкуюцца ў розных выданнях на беларускай, рускай, украінскай і замежных мовах. Мне здаецца, што ў сучасны момант на Беларусі ёсць шмат такіх выдатных вучоных, якія б змаглі ўсю сваю моц аддаць на тое, каб развіваць навуку на Беларусі. Для гэтай мэты трэба, каб НК асветы, з аднаго боку, і беларускі ўрад, з другога, падумалі над тым, каб на Беларусі адчыніць Беларускую Акадэмію навук» [1].

У 1928 г. на базе Інстытута беларускай культуры была створана Акадэмія навук БССР. На першых выбарах у Акадэмію 26 снежня 1928 г. У. І. Пічэта быў выбраны яе правадзейным членам [1] і да канца свайго жыцця прымаў непасрэдны ўдзел у яе рабоце. 30 кастрычніка 1926 г. у сувязі з 25-годдзем навуковай дзейнасці ўрад БССР прысвоіў У. І. Пічэту ганаровае званне заслужанага прафесара БССР [2]. З 1921 па 1930 г. Пічэта выбіраўся членам ЦВК Беларусі, удзельнічаў у рабоце з'ездаў Саветаў Беларусі, не раз выбіраўся дэпутатам Мінскага гарадскога Савета ад БДУ.

У. І. Пічэта быў вучоны выключнай эрудыцыі і разнастайных інтарэсаў, ён добра валодаў рускай, беларускай, украінскай, англійскай, нямецкай, французскай, італьянскай, польскай, чэшскай, сербскай, балгарскай, лацінскай, старажытнарускай мовамі.

У асабістай бібліятэцы У. І. Леніна ў Крамлі захаваліся кніга У. І. Пічэты «Уводзіны ў рускую гісторыю» (1922), а таксама «Працы БДУ ў Мінску» №№ 1 і 2—3 за 1922 г., дзе змешчаны яго артыкулы: «Валочная ўстава каралевы Боны і ўстава аб валоках» і «Наказ старастам і дзяржаўцам і валочная ўстава».

[1] «Савецкая Беларусь», 12 красавіка 1927 г.

[1] Архіў АН БССР, ф. I, спр. 52, арк. 5.
[2] ЦДАКР і СБ БССР, ф. 205, воп. 3, адз. зах. 6335, арк. 22.




**Гурток беларускай культуры, арганізаваны па ініцыятыве У. І. Пічэты. У цэнтры — Я. Колас, Зм. Бядуля і Ц. Гартны.**

У апошні перыяд свайго жыцця У. І. Пічэта працаваў у Маскве, у АН СССР і Маскоўскім універсітэце. У канцы 1946 г. яго абралі правадзейным членам АН СССР.

Памёр Уладзімір Іванавіч Пічэта 23 снежня 1947 г. на 69-м годзе жыцця. У 1961 г. выдавецтва АН СССР выпусціла вялікую кнігу «Беларусь і Літва XV—XVI ст. ст.», куды ўвайшлі выбраныя працы выдатнага савецкага гісторыка.

**Э. Р. ІОФЕ,**
**настаўнік гісторыі СШ № 100 (Мінск), аспірант-завочнік Інстытута гісторыі АН БССР.**

# З ГІСТОРЫІ ВЫВУЧЭННЯ ПАЛЕССЯ

Доўгі час Палессе заставалася загадкавым для геолагаў краем.

У кнізе «Рэльеф Прыпяцкага Палесся» (Масква, 1960) вядомы географ С. С. Каржуеў піша: «У гісторыі даследавання Палесся можна вылучыць тры этапы. Першы з іх ахоплівае прамежак часу з пачатку XVI да апошніх дзесяцігоддзяў XIX стагоддзя. У гэты час панавала ўяўленне пра Палессе як пра старажытнае «Пінскае мора». На другім этапе, што доўжыўся да Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, шырока бытавала ідэя П. А. Туткоўскага, які лічыў Палессе выкапнёвай пустыняй. Нарэшце, у трэці перыяд—савецкі час—прызнанне набыў ... распрацаваны Б. Л. Лічковым погляд на Палессе як на алювіяльную (рачную.—Р. Б.) раўніну».

Барыс Леанідавіч Лічкоў—арыгінальны мысліцель і геолаг-тэарэтык, блізкі друг вялікага вучонага У. І. Вярнадскага—займае пачэснае месца сярод геолагаў і географаў, якія вывучалі Беларускае Палессе.

Сёння здаецца дзіўным, што нізіннае, балоцістае Палессе некаторыя вучоныя лічылі былой пустыняй. Пасля таго, як адступіў ляднік, на Палессі, на думку Туткоўскага (з 1918 г.—акадэміка АН Украіны), уладарылі сухмень, сонца і вецер. Доказ—мноства вялікіх і малых пясчаных град і пагоркаў. «Палескія барханы—дзеці пустыні»,—сцвярджаў Туткоўскі. І ніхто, нават самыя буйныя вучоныя (Д. М. Анучын, А. П. Паўлаў, А. І. Ваейкаў), не мог пахіснуць яго аўтарытэт. Зрабіў гэта Б. Л. Лічкоў, якому хапіла смелай думкі, дасканалага ведання канкрэтных фактаў, умельства іх абагульняць, каб не толькі аспрэчыць, а і пераканаўча абвергнуць гіпотэзу П. А. Туткоўскага.

На Палессі Лічкоў працаваў яшчэ да рэвалюцыі, будучы студэнтам Кіеўскага універсітэта. Пазней ён даследаваў даліну Дняпра, а потым і Прыпяцкае Палессе. Тут ён не знайшоў ніякіх слядоў выкапнёвых пустынь. «Менавіта агромністыя пясчаныя прасторы рачных далін далі падставу думаць пра пустыні,—пісаў Лічкоў.—Тым часам у сапраўднасці гэтыя вялізныя накапленні тэрасавага характару гаварылі якраз не пра пустыню, а пра зусім супрацьлеглую з'яву—пра багацце вод, што расцякаліся па шырокіх прасторах на краі ледніка». У другой працы Лічкоў апісаў палескія дзюны (не барханы!) і адзначыў, што спачатку патокі вады збіралі пяскі ў выглядзе выцягнутых валаў і толькі пазней, за невялікі тэрмін, гэтыя валы былі развеяны ветрам. «Тэрыторыя Палесся,—піша Лічкоў,—у нядаўні геалагічны час значна апусцілася, і таму... рэкі яе моцна забалоцілі, а цяпер тыя ж рэкі яе пакрысе асушваюць».